*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома. Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 7 (352) | Субота, 14 лютага 1959 года | Цана 20 кап.

## ЗА ПРАЦУ, ТАВАРЫШЫ!

*ВЯЛІКАЯ ПА СВАІМ значэнні праграма камуністычнага будаўніцтва, намечаная нечарговым XXI з'ездам КПСС, ставіць перад савецкай вышэйшай школай новыя адказныя задачы. У дакладзе тав. М. С. Хрушчова, у выступленнях многіх дэлегатаў, у рашэннях, адзінадушна прынятых з'ездам, ясна падкрэсліваецца, што для пераходу да камунізма неабходна не толькі магутная матэрыяльна-тэхнічная база, але і высокі ўзровень свядомасці ўсіх членаў сацыялістычнага грамадства. Таму пытанні камуністычнага выхавання, народнай адукацыі, развіцця навукі і культуры займаюць значнае месца ў сямігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959—1965 гады.*

*Навука ў сучасны перыяд пабудовы камуністычнага грамадства набывае ўсё большае значэнне. Адзначаючы яе вялікія дасягненні ва ўсіх галінах ведаў, асабліва ў галіне ядзернай фізікі і атамнай энергетыкі, рэактыўнай авіяцыі і ракетнай тэхнікі, XXI з'езд пастанавіў дасягнуць на працягу сямі год яшчэ больш шпаркага развіцця ўсіх галін навукі, ажыццяўлення важных тэарэтычных даследаванняў, якія забяспечаць далейшы навукова-тэхнічны прагрэс. З гэтай мэтай неабходна прадугледзіць шырокую праграму навукова-даследчых работ, сканцэнтраваўшы навуковую сілу і сродкі на важнейшых напрамках, якія маюць практычнае і тэарэтычнае значэнне.*

*З новай сілай падкрэсліваецца неабходнасць умацавання сувязяў навуковых устаноў з практыкай, шырокага і своечасовага ўкаранення ў народную гаспадарку навуковых дасягненняў навукі і тэхнікі.*

*У галіне грамадскіх навук, асабліва перад эканамічнай навукай, стаіць задача творчага абагульнення вопыту гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і даследавання новых пытанняў, вылучаемых жыццём. Неабходна глыбока вывучаць заканамернасці пераходу да камунізма, усебакова аналізаваць важнейшыя працэсы, якія адбываюцца ў капіталістычным свеце, выкрываць буржуазную ідэалогію, змагацца за чыстату марксісцка-ленінскай тэорыі.*

*Вышэйшая школа мае ўсе магчымасці з гонарам выканаць гэтыя вялікія задачы. Вышэйшая школа, як адзначыў у сваім выступленні на з'ездзе міністр вышэйшай адукацыі В. П. Ялюцін, мае ў гэтых адносінах нават значныя перавагі перад іншымі відамі навуковых устаноў. Галоўная з іх заключаецца ў тым, што ВНУ маюць вялікую колькасць маладых кадраў, маюць магчымасць падбіраць для навукі найбольш таленавітых маладых людзей. Іменна ў вышэйшай школе можна забяспечыць найлепшае спалучэнне вопытных вучоных са смела шукаючай новых шляхоў у навуцы моладдзю.*

*У сувязі з гэтым вялікае значэнне набывае выхаванне савецкіх студэнтаў у духу калектывізму, працавітасці і ўсведамлення грамадскага абавязку, у духу сацыялістычнага інтэрнацыяналізма і патрыятызма, у духу захавання высокіх прынцыпаў маралі новага грамадства. У выпрацоўцы гэтых высокіх якасцей вялікую дапамогу павінен аказаць нашай студэнцкай моладзі непасрэдны ўдзел у вытворчай працы.*

*Працоўнае выхаванне моладзі з'яўляецца самым дзейсным сродкам камуністычнага выхавання. Студэнцкую моладзь трэба вучыць ахвотна, з любоў'ю выконваць не толькі перспектыўную навуковую, але і радавую працу з поўнай адказнасцю за вынікі даручанай справы.*

*У гэтым напрамку намі яшчэ зроблена вельмі мала. Сярод некаторай часткі моладзі нашага ўніверсітэта праяўляюцца пэўныя элементы зазнайства, фанабэрыстасці, пагардлівых адносін да чарнавой працы. У нас яшчэ недастаткова ўлічваюцца такія важныя элементы фарміравання маладых спецыялістаў, як выхаванне волі, упартасці, настойлівасці ў пераадоленні цяжкасцей.*

*Тав. М. С. Хрушчоў, выступаючы на вечары выпускнікоў Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, справядліва адзначыў гэтыя недахопы і заклікаў моладзь рыхтаваць сябе да простай, радавой напружанай працы поплеч з рабочымі і калгаснікамі. З вышэйшай школы павінны выходзіць сціплыя працаўнікі, здольныя і гатовыя выконваць самую простую, чарнавую работу, усведамляючы, што ўсякая карысная праца з'яўляецца ганаровай і неабходнай у савецкім грамадстве.*

*Поспех вялікай сямігодкі будзе вырашацца на прадпрыемствах і будоўлях, у калгасах і саўгасах, у навуковых і навучальных установах. Перамога не прыдзе сама па сабе, яе неабходна заваяваць і замацаваць. Кожны працаўнік нашай савецкай дзяржавы павінен зрабіць усё для таго, каб унесці свой дастойны ўклад ва ўсенародную справу. Партыя заклікае: за працу, таварышы! Няхай кожны наш працоўны і вучэбны дзень будзе адзначаны новымі поспехамі на шляху да вялікай мэты—камунізма!*

## Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

**Аб узнагароджанні Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР драматычнага калектыва БДУ імя У. І. Леніна, удзельніка дэкады мастацкай самадзейнасці, прысвечанай 40-годдзю Беларускай ССР**

За дасягнутыя поспехі ў развіцці мастацкай самадзейнасці і паспяховы ўдзел у дэкадзе мастацкай самадзейнасці, прысвечанай 40-годдзю Беларускай ССР, узнагародзіць **Граматай Вярхоўнага Савета БССР** драматычны калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. КАЗЛОЎ.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Д. ЛУКАШЭВІЧ.**

## НАШЫ КАНДЫДАТЫ

Адбыўся прадвыбарчы сход студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Мінскага гарадскога і Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных г. Мінска.

Сход аднадушна вылучыў і рашыў прасіць акруговыя выбарчыя камісіі зарэгістраваць кандыдатамі ў дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных наступных таварышаў: прафесара І. М. ЛУШЧЫЦКАГА, дацэнта В. Ф. ЯКУШКА, сакратара Мінскага гаркома КПБ І. М. ІГНАЦЕНКУ, дацэнта Е. П. ЕРЭСЬ, пенсіянера М. С. АРЛОВА.

Прафесар І. М. СЯРЖАНІН, асістэнт Л. І. МАЛІШЭЎСКАЯ і дацэнт С. Г. СКАПЦОЎ вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных г. Мінска.

## ПАСПЯХОВА ВЫТРЫМАЦЬ КОЖНЫ ЭКЗАМЕН

☆ ☆

### Добра,—кажа экзаменатар

—Я нават не чакала, што вынікі будуць такія добрыя,—сказала экзаменатар кандыдат хімічных навук Валодзька.—Тым больш, што прадмет даволі цяжкі. Відаць, студэнты добра папрацавалі, бо амаль усе паказалі грунтоўныя і глыбокія веды, адказвалі куды лепш, чым у мінулым годзе. Праўда, гэты курс лічыцца адным з лепшых на факультэце. Што ж, гэтае права яны заваявалі ўпартай і настойлівай працай, вялікай прагай да ведаў. Я вельмі задаволена вынікамі экзамена...

Так, вынікі ў студэнтаў чацвёртага курса хімічнага факультэта добрыя. Яны толькі што здалі экзамен па будове малекулы. Прадмет нялёгкі, і многія нямала хваляваліся перад экзаменам. Але хваляванне было дарэмным. Яшчэ не адказала і палавіна групы, а ў заліковых кніжках Галі Чырковай, Нэлі Пціцынай, Лілі Хомскай з'явіліся пяцёркі. Жэня Жарыкава, Раксана Рагожына, Лена Ярмоленка і многія іншыя артымалі чацвёркі. Дзяўчаты крыху незадаволены, яны таксама добра ведалі прадмет і, што казаць, хацелі атрымаць пяцёркі.

—Нічога, дзяўчаты, не сумуйце. Гэта ж не апошні экзамен. Галоўнае—добрасумленна рыхтавацца да экзаменаў. Тады і адзнакі будуць добрыя.

М. ШЫМАНСКІ.

☆ ☆

### ЯКАЯ ПРАЦА—ТАКІЯ І ВЫНІКІ

Сярод студэнтаў ходзяць яшчэ такія словы: «Экзамены—гэта гульня ў карты». З такімі вывадамі можа згадзіцца толькі той студэнт, які мае хібы ў сваіх ведах па тых ці іншых пытаннях, якія бегла праглядзеў, недакладна разабраўся, недачытаў або зусім прапусціў.

Але часта здараецца так, што студэнты атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі. Тады яны скардзяцца самі на сябе: «Чаму я не працаваў больш уважліва, чаму?»

Пытанне застаецца ясным. Экзамены трэба сустракаць карпатлівай працай над кнігай. Той, хто быў у дружалюбных адносінах з падручнікамі на працягу ўсяго семестра, сустракае экзаменацыйную сесію радасна. Кожны экзамен для яго з'яўляецца святам. Гэта і сапраўды так.

Пяты курс геаграфічнага факультэта. У завочнікаў ідзе экзамен па фізічнай геаграфіі СССР. З указкай у руках каля геаграфічнай карты стаіць А. А. Дробыш. Ён упэўнена адказвае на пытанні білета «Ламаносаў і яго роля ў развіцці геаграфіі» і «Вобласць тайгі Кольскага паўвострава». Ён расказвае і адначасова паказвае па карце ўсе, што неабходна. Яго адказ змястоўны, цверды. На дадатковыя пытанні Дробыш таксама дае вычарпальныя адказы і атрымлівае «выдатна».

Студэнт гэтай жа групы І. Ф. Шэўчук атрымаў «нездавальняюча». Ён блытана, дрэнна адказаў на такія, здаецца, легкія пытанні, як вялікія рускія геаграфічныя адкрыцці ў шаснаццатым—семнаццатым стагоддзях і ступені засвоенасці і пытанні гаспадарчага скарыстання таежнай зоны. На дадатковыя пытанні або амаль нічога не адказаў, або блытаў адно з другім. Зразумела, чалавек нядобрасумленна адносіўся да вучобы, прышоў на экзамен непадрыхтаваным, таму і атрымаў дрэнную адзнаку. Вось відавочныя прыклады адказаў двух студэнтаў: якая праца—такія і вынікі.

Студэнты Малашанкаў, Шэпелеў, Рудскі і іншыя атрымалі чацверкі, а каму давялося задаволіцца і тройкай.

У географаў-завочнікаў III курса становішча значна горшае. Экзамен па геамарфалогіі большасць студэнтаў здала на «здавальняюча» і «нездавальняюча». Толькі некаторыя атрымалі чацверкі.

Д. БЯСПАЛЫ.



Аб чым марыць гэты нікому яшчэ невядомы будучы даследчык? Мусіць, аб антарктычных экспедыцыях ці міжпланетных палетах? Але куды б ні закінуў яго лёс, мы ўпэўнены, што ён з гонарам пранясе высокае званне выпускніка БДУ.

Фота А. Лукашова.

# Вачыма аб'ектыва...



Здымак 1.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ ідзе сесія. Яна не абмінае ні аднаго чалавека. Яшчэ зусім нядаўна з яе надыходам у калідорах перад дзвярыма аўдыторый, дзе павінны былі адбыцца першыя ў іх жыцці экзамены, збіраліся купкі палахлівых першакурснікаў. Напэўна, Цэзару лягчэй было рашыцца перайсці Рубікон, чым ім парог гэтых аўдыторый.

Але што ж, пачалі здаваць экзамены і студэнты старэйшых курсаў, а вядуць сябе перад дзвярыма, як гэтыя самыя першакурснікі, што цяпер ужо з вышыні сваёй першай здадзенай сесіі паглядаюць на старэйшых таварышоў. Што ж, гэта і натуральна. Паняцці «студэнт» і «экзамены» такія ж непадзельныя, як паняцці «рыба» і «вада». І ці то першы экзамен у студэнцкім жыцці, ці апошні, напэўна, не знойдзецца чалавека, які б не хваляваўся перад ім.

Вось і сёння студэнты III курса геафака, што прыйшлі здаваць экзамен па фізічнай геаграфіі, хвалююцца, як першакурснікі. Найбольш нервовыя таварышы ходзяць і ахаюць: «Ах, мы нічога не ведаем!» Хоць, як правіла, такія ныцікі паспелі паўтарыць праграмны матэрыял разы па тры. Да таго ж кожнаму вядома, што ў час перад экзаменамі разбураецца існуючае ва ўсіх уяўленне аб мяжы магчымага і немагчымага. Ва ўсякім выпадку ў ноч перад экзаменам прачытваецца і засвойваецца столькі, што ў другі час для гэтага патрабаваліся б тыдзень-два. І не бяда, што ў чыталках і кабінетах бадай што нельга знайсці свабоднага месца. Студэнты—народ вынаходлівы. Так Вадзім Слёсберг даказаў, што па звычайных лесвіцах можна не толькі хадзіць, але з іх дапамогай і штурмаваць крэпасць навукі (здымак першы). Хоць і кажуць, што перад смерцю не надыхаешся, але хто ведае...

У гэты час ля дзвярэй замяшанне.

—Жэнька Яновіч выскачыў,—паведамляе нехта.

—Уф,—толькі і можа сказаць той.



Здымак 2.

Сябры горача вітаюць Яўгена, усё яшчэ перажываючага ўсе перыпетыі экзамена, і адначасова спрачаюцца, каму заходзіць наступнаму (здымак другі).

Нарэшце смяльчак знаходзіцца. «Пасля ты пойдзеш»,—строга гавораць аднакурснікі Сяргею Быстрыку, пра якога нельга сказаць, што ён гарыць жаданнем хутчэй прадстаць перад вачыма экзаменатара.

Ад гэтых слоў у Сяргея чамусьці з'явіўся апетыт.

—Падмацавацца ніколі не перашкаджае,—філасофскі разважае ён.—Гэта дазваляецца чалавеку нават тады, калі ён ідзе на эшафот, а тым больш на экзамен (здымак трэці).



Здымак 3.

Хваляванні за сяброў, жаданне даведацца, што трапіла таварышу, (а раптам тое пытанне, якое сам ведаеш з большага?!) прымушаюць студэнтаў ісці нават на парушэнне парадку і падглядваць у дзверы (здымак чацверты).



Здымак 4.

—Што табе? —шэпча ў шчылінку такі «балельшчык».

Адказу, зразумела, ён не чуе. Але колькі можа сказаць выраз твару!

—Ведаеш?

Відаць, назіранні заспакойваюць «балельшчыка», і ён пакідае свой пост, каб уступіць месца другому.

Сябры маглі не хвалявацца. Адказвала ў гэты час Люда Паўловіч. Дацэнт Абрам Яфімавіч Шкляр з задавальненнем слухаў яе адказ. І вось у заліковай кніжцы Люды рука экзаменатара выводзіць заслужанае «выдатна» (здымак пяты).



Здымак 5.

А наогул, добра адказвалі ў гэты дзень географы. 40 выдатных і добрых адзнак з 47 паставіў трэцякурснікам Абрам Яфімавіч. Асабліва вызначаліся адказы А. Жадан, З. Барыла, І. Афнагеля і іншых.

—Усё ж вельмі прыемна, калі атрымаеш пяць,—гаворыць Мая Усава (здымак шосты).



Здымак 6.

Фотарэпартаж
**А. ЛУКАШОВА**

# ДА ЎСІХ РАБОТНІКАЎ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ СССР

*Адкрытае пісьмо выкладчыкаў-спартсменаў Куйбышаўскага і Пензенскага педагагічных інстытутаў*

Глыбокапаважаныя калегі!

Мы, навуковыя работнікі і супрацоўнікі Куйбышаўскага і Пензенскага педагагічных інстытутаў, праводзячы таварыскую сустрэчу па трох відах спорту, вырашылі звярнуцца да ўсіх з адкрытым пісьмом.

Савецкая вышэйшая школа—гэта не толькі лабараторыя розуму, але і кузня здароў'я. За пяць гадоў у яе сценах можна падрыхтаваць кваліфікаваных спецыялістаў і ў той жа час добрых спартсменаў, якія будуць рухаць наперад савецкі спорт, перадаваць свой вопыт другому.

Але высокія дасягненні не могуць з'явіцца самі сабой: яны растуць толькі пры агульнай зацікаўленасці, пры добра пастаўленай масавай фізкультурнай рабоце, пры значным узроўні масавых спартыўных вынікаў.

Такая агульная зацікаўленасць у выдатных спартыўных выніках адсутнічае ў многіх ВНУ; за высокі ўзровень агульнага і культурнага развіцця студэнтаў змагаецца і адказвае ўвесь калектыў работнікаў вышэйшай школы, а за фізічную падрыхтоўку—толькі кафедры фізвыхавання пры даволі пасрэдным кантролі і дапамозе з боку адміністрацыі і грамадскіх арганізацый.

Пры такім становішчы і не можа быць інакш, таму што большасць работнікаў вышэйшай школы стаіць зусім у баку ад фізкультуры і спорту. Нават нядрэнныя спартсмены,за выключэннем адзінак, ператвараючыся са студэнтаў у выкладчыкаў, выключаюцца са спартыўнага жыцця ВНУ, прычым гэта распаўсюджваецца таксама на членаў кафедры фізвыхавання.

Мы лічым, што ў вышэйшай школе павінны быць створаны такія абставіны, каб ў паняцце «культура студэнта» арганічна ўваходзіла фізкультурна-спартыўная падрыхтаванасць, каб выхаванне добрых спартсменаў цікавіла ўвесь калектыў ВНУ. Для гэтага трэба многае, а ў прыватнасці—каб самі работнікі вышэйшай школы сталі бліжэй да фізкультуры і спорту. Любілі ж спорт вялікія рускія вучоныя, у тым ліку Іван Пятровіч Паўлаў.

Давайце сустракацца паміж сабой не толькі на навуковых канферэнцыях, але і на спартыўных спаборніцтвах: у сценах сваіх ВНУ не толькі гаварыць аб карысці фізкультуры, але і ўласным прыкладам прывіваць любоў да спорту і паказваць карысць заняткаў фізкультурай.

Давайце, праводзячы ўнутры ВНУ спаборніцтвы, выстаўляць ад факультэтаў для заліку па некаторых відах спорту не толькі студэнцкія, але і выкладчыцкія каманды. Гэта рэзка павысіць зацікаўленасць усяго калектыву ВНУ ў высокіх спартыўных паказчыках, узніме аўтарытэт фізкультуры і спорту. А такая зацікаўленасць дапаможа лепш вырашаць пытанні арганізацыі спартыўнай работы, пытанні стварэння баз, папаўнення і захавання спартыўных кадраў і г. д.

Некаторы вопыт такой работы ёсць: у Куйбышаўскім педінстытуце другі год існуе і расце фізкультурны калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, членаў ДСТ «Буравеснік». Праводзіцца ўнутры ВНУ спартакіяда, павялічваецца лік спартсменаў-разраднікаў; акрамя таго, выкладчыцкія каманды спаборнічаюць са студэнтамі і выступаюць у гарадскіх спаборніцтвах. У гэтым годзе па чатырох відах спорту праходзіць спартакіяда работнікаў усіх інстытутаў горада Куйбышава. Тое ж пачынаецца ў Пензенскім педінстытуце і, мабыць, мае месца і ў іншых ВНУ краіны.

Зараз у Савецкім Саюзе створаны студэнцкае спартыўнае таварыства і спартыўныя клубы вышэйшых навучальных устаноў, якія аб'ядноўваюць студэнтаў і работнікаў ВНУ. Новыя задачы патрабуюць і новых форм дзейнасці. Гэтыя задачы змогуць быць паспяхова вырашаны толькі ў тым выпадку, калі да ўздыму спартыўнай работы будуць прыцягнуты не толькі сілы ўсяго студэнцтва, але і ўсяго калектыву работнікаў вышэйшай школы.

Прыцягненне выкладчыкаў і супрацоўнікаў вышэйшых навучальных устаноў у фізкультурнае і спартыўнае жыццё павінны знайсці адлюстраванне ў новых планах Міністэрства і ў Статуце новага спартыўнага таварыства і спартыўных клубаў.

**(Далей ідзе 28 подпісаў)**

## Прэміі атрымліваюць лепшыя

З КОЖНЫМ ГОДАМ расце лік студэнтаў, якія прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце.

З мэтай заахвочвання навукова-даследчай работы студэнтаў рэктарат у гэтым годзе прэміраваў 24 студэнтаў за даклады, якія атрымалі найбольш высокую ацэнку на гарадскім аглядзе студэнцкіх работ. У ліку прэміраваных 6 студэнтаў біялагічнага факультэта, 2 — матэматычнага, 5—фізічнага, 2—юрыдычнага, 2—гістарычнага, 3—хімічнага, 3—філалагічнага факультэта.

Сучасным пытанням фізікі прысвечаны работы «Індыкацыя рэнтгенаўскіх праменняў з дапамогай тэрмістара» (студэнт V курса М. Цішкевіч. Кіраўнік дацэнт І. Г. Некрашэвіч), «Да пытання аб захаванні энергіі пры ўзаемадзеянні светавой хвалі з электрычным дыполем» (студэнт IV курса В. Рубанаў. Кіраўнік прафесар Б. І. Сцяпанаў).

Цікавая і арыгінальная работа студэнта V курса матэматычнага факультэта В. Спрынджука «Аб аддытыўных уласцівасцях некаторых лікавых мностваў».

Сярод работ гуманітарных факультэтаў заслугоўвае ўвагі работа Н. Лебедзевай «Творчыя шуканні сучаснай інтэлігенцыі ў адлюстраванні амерыканскіх раманістаў» (навуковы кіраўнік дацэнт Фактаровіч).

Трэба адзначыць, што лепшыя з лепшых работ прадстаўлены для ўзнагароджання граматамі і каштоўнымі падарункамі Міністэрства Вышэйшай адукацыі СССР.

Г. ГАЛКОЎСКАЯ, член камітэта камсамола.

## НАШЫ ТАВАРЫШЫ



Інтэрнаты, стыпендыі, падпіска на газеты, пуцёўкі, паспяховасць, дзесяткі сходаў і неабходнасць самому добра вучыцца—вось далёка не поўны пералік турбот Васі Жданко, студэнта III курса геаграфічнага факультэта. Але жыццёвы вопыт, унутраная сабранасць, выхаваная ў арміі, патрабавальнасць да другіх і ўдвая да сябе, умелы падыход да людзей—усё гэта незаменныя памочнікі ў прафсаюзнай рабоце.

—Наш прафсаюзны бог!—так жартаўліва называюць Васю Жданко студэнты. Фота і тэкст А. ЛУКАШОВА.



ВЫПУСКНІКІ 2000 ГОДА

—Ты куды атрымаў накіраванне на работу?

—На Марс.

—Табе пашанцавала—ты застаўся ў сонечнай сістэме.

Мал. А. Саккана з румынскага сатырычнага часопіса «Урзіка».

Іх норавы

## Клуб „малалетніх“

Чатырнаццацігадовы Эдоус Шэнан арганізаваў у Індыянапалісе (ЗША) дзіцячы клуб, задачай якога з'яўляецца... перавыхаванне бацькоў.

Апублікаваны заклік да ўсіх дзяцей не старэй дзесяці год уступіць у клуб. У закліку гаворыцца: «Свабодныя і шчырыя дыскусіі членаў клуба павінны дапамагчы выкрыць памылкі і слабасці бацькоў, а таксама садзейнічаць пераадоленню іх мірным шляхам. Гвалтоўныя метады, метады прымусу не павінны больш мець месца».

Насустрач студэнцкім канікулам

# Парады арганізатарам лыжных паходаў

ШМАТ ЦІКАВЫХ мерапрыемстваў чакае студэнтаў універсітэта ў час зімовых канікулаў. Паездкі па турысцкіх маршрутах, знаходжанне ў санаторыях і дамах адпачынку, культпаходы ў кіно і тэатры, лыжныя паходы—вось далёка не поўны пералік усяго таго, што чакае студэнтаў. Ніжэй мы змяшчаем некалькі парад арганізатарам і ўдзельнікам лыжных паходаў.

1. Факультэцкія бюро фізкультуры загадзя праводзяць запіс жадаючых удзельнічаць у паходзе і разбіваюць іх на групы па 10—15 чалавек.

2. Дакладныя заяўкі з указаннем тэрміну выхаду ў паход і нумару лыжнага абутку падаюцца на кафедру фізічнага выхавання.

3. Каманды складаюцца не больш чым з 15 чалавек, таму што для вялікіх груп цяжэй арганізаваць начлег і харчаванне. Пры падборы каманд трэба ўлічваць два фактары: жаданне і адпаведныя фізічныя даныя.

4. Неабходна ў час паходу праводзіць агітацыйную работу ў пункце адпачынку, а іменна: дапамога камсамольскім арганізацыям калгасаў выпусціць насценную газету, намаляваць лозунгі, правесці цікавую гутарку, а калі ў групе ёсць спевакі, дэкламатары, танцоры—правесці вечар моладзі.

5. Маршруты павінны быць складзены так, каб у першы дзень дарогі ўдзельнікі прайшлі не больш чым 10—12 кіламетраў.

6. Выгадна пусціць больш моцныя каманды па разрадных турысцкіх маршрутах.

### У ЧАС ПАХОДУ

1. Не трэба захапляцца пераходамі па цаліне, нават калі гэта акажацца бліжэй, чым па дарозе. Такі пераход цяжэйшы, ды і компас часам падводзіць.

2. Ні ў якім разе нельга мець адстаючых, мерзнучых і г. д. Неабходна мець аптэчку, змену бялізны, сухія шкарпэткі і спірт.

### ВЫНІКІ:

У час паходу студэнты лепш пазнаюць адзін аднаго, каманды доўга не распадаюцца, з іх ствараецца сапраўдны факультэцкі актыў. Калі ўсё правесці па-дзелавому, то ў будучым будзе прасцей арганізаваць любое масавае грамадска-карыснае мерапрыемства на факультэтах.

М .ШЭЙНЕМАН, старшыня праўлення спартыўнага клуба.

Калектыў супрацоўнікаў выдавецтва і друкарні БДУ імя У. І. Леніна выказвае глыбокае спачуванне КІСЯЛЁВАЙ Ірыне Васільеўне з выпадку напаткаўшага яе цяжкага гора—смерці сына.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000. Зак. 221.